**Мармузевіч Г.М.,**
*аспірантка кафедры*
*харавога мастацтва*

# З ГІСТОРЫІ МУЗЫЧНА-ГРАМАДСКАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСІ АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XIX–ПАЧАТКУ XX СТ.

У 80-я гады мінулага стагоддзя музычнае жыццё ў Мінску, Магілёве, Віцебску, Гродне і іншых гарадах Беларусі прыкметна актывізуецца і характарызуецца новымі тэндэнцыямі. У выніку хуткага росту шляхоў зносін (галоўным чынам чыгуначнага транспарту) да канца 70-х гадоў у Беларусі значна павялічваецца колькасць гастраліруючых артыстаў і музыкантаў. Адпаведна актывізуецца і дзейнасць мясцовых музыкантаў і аматараў музыкі. У апошняй чвэрці XIX ст. у розных гарадах Беларусі ўзнікаюць музычныя таварыствы і іншыя музычна-грамадскія арганізацыі, якія аб'ядноўваюць мясцовых аматараў мастацтва. Яны былі выкліканы да жыцця грамадска-дэмакратычным уздымам 80-х гадоў XIX ст., які прывёў да сур'ёзных змяненняў ва ўсёй структуры грамадскага музычнага жыцця.

З прычыны дэмакратызацыі грамадскага жыцця членства ў музычных таварыствах становіцца даступным масе дэмакратычна настроенай інтэлігенцыі, а таксама ўсім аматарам музыкі і мастацтва, незалежна ад сацыяльнага паходжання. На змену салонным, гуртковым формам арганізацыі музычна-грамадскай дзейнасці, хатняму музіцыраванню прыходзяць больш буйныя аб'яднанні і таварыствы, якія маюць якасную юрыдычную функцыянальную арганізацыю. Акрамя таго, з'яўленню такіх таварыстваў у Беларусі спрыяла дзейнасць Рускага музычнага таварыства (1856—1917), якое адыграла асаблівую ролю ў прапагандзе класічнай музыкі і ў развіцці рускай прафесійнай музычнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музычна-грамадскія аб'яднанні, у сферу інтарэсаў якіх уваходзіла музыка, падзяліліся на:

а) таварыствы вузкаспецыялізаванага накірунку (музычныя таварыствы і гурткі);

б) таварыствы, якія мелі два накірункі развіцця (музычна-драматычныя, музычна-пеўчыя, літаратурна-музычныя і літаратурна-артыстычныя таварыствы);

в) таварыствы шырока спецыялізаванай накіраванасці або змешаныя тыпы таварыстваў (літаратурна-музычна-драматычныя таварыствы і гурткі, таварыствы аматараў музыкі, спеваў і драматычнага мастацтва, таварыствы аматараў прыгожых мастацтваў і культурна-асветніцкія таварыствы).

Музычна-грамадскія арганізацыі ўяўлялі сабой арганізацыйна афармленыя аб'яднанні аматараў музыкі. Кожнае таварыства мела статут, у якім выкладаліся мэты і задачы таварыства, яго правы, склад, кіраванне і сродкі.

Музычныя аб'яднанні свядома арыентаваліся на шырокую грамадска-асветніцкую дзейнасць, ставілі сваёй мэтай развіццё музычнай культуры беларускіх гарадоў, дапамогу іх жыхарам атрымліваць музычную адукацыю. Так, у статуце Брэсцкага музычна-драматычнага таварыства было запісана, што яно "мае мэтай даваць магчымасць членам прысвячаць гадзіны ў вольны час музычнаму мастацтву і развіццю ў сваім асяроддзі наогул эстэтычнай адукацыі". Мсціслаўскі музычна-драматычны гурток (1895 г.) павінен быў "даваць магчымасць сваім членам збірацца ў памяшканні ... дзеля выканання музычных і драматычных твораў, развіваючы ў іх музычныя і драматычныя здольнасці". Для дасягнення гэтых мэт музычна-грамадскія аб"яднанні наладжвалі спектаклі, канцэрты, музычныя вечары, літаратурныя чытанні, адкрывалі бібліятэкі.

Звычайна такія таварыствы ўзнікалі па ініцыятыве невялікай групы мясцовай інтэлігенцыі, якая звярталася з адпаведным хадайніцтвам да губернатара, прымала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праект статута. Канчатковае вырашэнне пытання і зацвярджэнне статута былі ў распараджэнні міністра ўнутраных спраў. Улады з падазронасцю ставіліся да адкрыцця новых аб'яднанняў, усяляк урэзвалі іх правы, закрывалі ўжо дзеючыя таварыствы. Яўрэйскім і латышскім таварыствам часцей за ўсё наогул адмаўлялі.

Адной з прычын адмовы ў рэгістрацыі новых і закрыцця ўжо існуючых таварыстваў была палітычная ненадзейнасць іх членаў. Некаторыя аб'яднанні былі прызнаны пагражаючымі грамадскаму спакою і бяспецы. Яны абвінавачваліся ў захаванні і распаўсюджванні нелегальнай рэвалюцыйнай літаратуры, а таксама ў прыналежнасці да мясцовых арганізацый Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі. На думку ўладаў, многія арганізацыі вялі да нацыянальнай адасобленасці, мелі мэтай не проста дабрачыннасць альбо заняткі музыкай, а згуртаванне мясцовага насельніцтва і выхаванне моладзі ў нацыянальным духу.

Заснавальнікамі музычна-грамадскіх аб'яднанняў, акрамя прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі (урачоў, настаўнікаў, гарадскіх архітэктараў), былі таксама служачыя, чыноўнікі, члены суда, вышэйшыя ваенныя чыны. Некаторыя заснавальнікі займалі высокія дзяржаўныя пасады і мелі дваранскія тытулы. Часта арганізатарамі і членамі музычна-грамадскіх аб'яднанняў з'яўляліся сямейныя дынастыі, а таксама гарадскія і вясковыя жыхары (сяляне, памешчыкі).

Музычныя таварыствы займаліся дабрачыннай дзейнасцю: давалі канцэрты і спектаклі з дабрачыннай мэтай; выдавалі разавыя альбо пастаянныя субсідыі аматарам музыкі, якія мелі добрыя музычныя здольнасці, прызначалі стыпендыі; праводзілі конкурсы і выдавалі грашовыя і іншыя прэміі.

З мэтай развіцця прафесійнай музычнай адукацыі многія музычныя таварыствы адкрывалі музычныя класы і курсы, дзе жадаючыя навучаліся спевам, ігры на фартэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

піяна, струнных і духавых інструментах, вывучалі тэорыю музыкі. Навучанне вялося на высокім прафесійным узроўні. Пры некаторых музычна-грамадскіх аб'яднаннях адкрываліся музычныя бібліятэкі і музеі. Напрыклад, пры Таварыстве сяброў музыкі былі створаны чытальня і бібліятэка кніг, часопісаў і газет, якія тычыліся музычнага мастацтва.

Першым такім аб'яднаннем, якое было адкрыта ў Мінску ў 1880 годзе, стала Мінскае музычнае таварыства. Заснавальнікамі яго выступілі 50 лепшых мінскіх прафесіяналаў і аматараў музыкі. Яны выпрацавалі статут, галоўнымі мэтамі якога былі "садзейнічанне распаўсюджванню музычнай асветы і адукацыі ў горадзе Мінску, дапамога ў развіцці ўсіх галін музычнага мастацтва, падтрымка таленавітых кампазітараў і выканаўцаў". Акрамя таго, у статуце аб'яднання было запісана, што яно "павінна даваць сваім удзельнікам магчымасць збірацца дзеля выканання розных твораў музычнага мастацтва". Арганізатары таварыства хацелі адкрыць музычную школу, устанавіць стыпендыю здольным да музыкі асобам, не маючым магчымасці плаціць за адукацыю. У сімфанічных і вакальных канцэртах, якія наладжвала Мінскае музычнае таварыства, прымалі ўдзел лепшыя выканаўчыя сілы Мінска той пары. З цягам часу дзейнасць таварыства набыла вялікі размах, аднак у 1883 годзе з-за бясконцых прычэпак царскай цэнзуры і значных матэрыяльных цяжкасцей таварыства вымушана было спыніць сваю дзейнасць.

У 1886 годзе ў Мінску было адчынена новае музычнае аб'яднанне, якое існавала да канца 90-х гадоў. Ім кіраваў Генрых Густававіч Мерп, ён жа ўзначальваў хор і аркестр аб'яднання. У 1888 годзе Мінскае музычнае аб'яднанне было перайменавана ў музычна-драматычнае, аднак і яно хутка спыніла сваю дзейнасць.

Становішча крыху змянілася, калі 19 лістапада 1898 года быў зацверджаны статут новага (больш шырокага па складу і мэтах) аб'яднання аматараў прыгожых мастацтваў. Яно праіснавала 7 гадоў і атрымала грамадскае прызнанне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб'яднанне было створана па ініцыятыве знакамітага рускага пісьменніка Яўгена Чырыкава, які жыў у той час у Мінску, рэвізора акцызнага ўпраўлення А.Аляксандрава і іншых прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі. Па статуце аб'яднання ў сферу яго дзейнасці ўваходзілі жывапіс, паэзія, драматычнае майстэрства і мастацкае чытанне. Аб'яднанню была дадзена магчымасць праводзіць мастацкія выставы, канцэрты, літаратурныя і музычныя вечарыны і спектаклі, публічныя чытанні і лекцыі, адкрыць бібліятэку, выдаваць кнігі і часопісы. Акрамя гэтага, у выпадку наяўнасці сродкаў аб'яднанне магло адкрыць школы жывапісу, пластыкі, музыкі, дэкламацыйнага і сцэнічнага мастацтваў, а таксама зняць у якасці сцэны для выступлення гарадскі альбо прыватны тэатр.

Аб'яднанне было складзена з чатырох секцый: літаратурнай, драматычнай, музычнай і мастацкай. Музычная секцыя звычайна праводзіла вечарыны, на якіх можна было пачуць творы рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў, сцэны з оперных спектакляў (а іншы раз цэлыя акты).

У 1903 годзе пры аб'яднанні былі адкрыты бясплатныя музычныя класы па тэорыі і практыцы харавых спеваў. У 1905 годзе, ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму, аб'яднанне аматараў прыгожых мастацтваў з асветніцкага ператварылася ў своеасаблівы палітычны клуб, і летам 1906 года мінскі губернатар забараніў яго дзейнасць.

Музычнае жыццё горада са спыненнем дзейнасці Мінскага аб'яднання аматараў прыгожых мастацтваў не скончылася. У 1907 годзе было адкрыта Літаратурна-артыстычнае таварыства, сіламі якога было пастаўлена шмат музычна-сцэнічных твораў. Цэнтрам музычнага жыцця Мінска ў пачатку новага стагоддзя было Таварыства сяброў музыкі (1912 г.) і музычнае вучылішча, якое дзейнічала пры ім. Ініцыятарам стварэння гэтага аб'яднання і вучэбнай установы з'явіўся знакаміты скрыпач М.Рубінштэйн, які шмат выступаў з сольнымі праграмамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ў камерных аркестрах. Заняткі былі на вячэрнім і дзённым аддзяленнях па класах фартэпіяна, спеваў, скрыпкі, тэорыі, гармоніі, сальфеджыо, віяланчэлі і духавых інструментаў.

Вучні і настаўнікі вучылішча сістэматычна выступалі ў канцэртах. За навучальны год давалася 5-6 камерных і сімфанічных канцэртаў, дзе гучалі творы Й.Гайдна, Р.Шумана, П.Чайкоўскага, Ф.Мендэльсона, Л.Бетховена.

Трэба сказаць, што і ў іншых гарадах Беларусі, такіх як Віцебск і Магілёў, музычнае жыццё не стаяла на месцы. Зручнае геаграфічнае становішча Віцебска часта дазваляла наведваць гэты горад розным гастралёрам. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя ў Віцебску таксама ўзнікаюць музычныя аб'яднанні. Дакладней кажучы, Віцебскае музычнае аб'яднанне (1874 г.) было заснавана на 6 гадоў раней, чым першае падобнае аб'яднанне ў Мінску. Гэта сведчыць аб высокім узроўні развіцця музычнай культуры ў гэтым горадзе.

Заслугоўвае ўвагі творчая актыўнасць, якую праяўлялі аматары тэатральна-музычнага мастацтва ў Музычна-драматычным аб'яднанні, заснаваным у 1883 годзе. З другой паловы 80-х гадоў членамі Музычна-драматычнага аб'яднання "ва ўласным памяшканні" праводзіліся аматарскія вечарыны, на якіх выконваліся арыі і сцэны з опер. Віцебскім аматарам удалося здзейсніць пастаноўку некалькіх музычна-сцэнічных твораў, у тым ліку такіх буйных опер, як "Фаўст" Ш.Гуно і "Русалка" А.Даргамыжскага.

Значную ролю ў дзейнасці Віцебскага музычна-драматычнага аб'яднання адыгрываў аркестр аматараў пад кіраўніцтвам мясцовага музыканта і кампазітара І.Шадурскага.

У мэтах развіцця музычна-драматычнага мастацтва ў Віцебску ў 1906 годзе ствараецца новы музычна-драматычны гурток. У ліку арганізатараў быў кампазітар і педагог М.Анцаў. Гурток аб'яднаў 150 прадстаўнікоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мясцовай інтэлігенцыі і быў складзены з музычнай і драматычнай секцый. Музычная секцыя ў сваім складзе мела квартэт і сімфанічны аркестр. У кожным сезоне (з кастрычніка па май) праходзілі 20-30 музычных і тэатральных вечарын, большая частка якіх была праграмная. І, нарэшце, важнай падзеяй музычнага жыцця горада было адкрыццё ў 1915 годзе Віцебскага аддзялення Рускага музычнага аб'яднання і музычных класаў пры ім.

Не адставаў у сваім музычным развіцці ад іншых беларускіх гарадоў і Магілёў. У горадзе даволі часта выступалі групы гастралёраў, аркестры, знакамітыя выканаўцы. У Магілёве актыўна вяла работу мясцовая аматарская музычна-грамадская арганізацыя — Літаратурна-музычны драматычны гурток. Намаганнямі гэтага гуртка ў гарадскім тэатры былі пастаўлены сцэны і акты з вядомых опер.

У апошняй чвэрці XIX—пач. XX ст. падобныя музычныя, літаратурна-артыстычныя таварыствы і іншыя культурна-асветніцкія аб'яднанні адкрываліся ў многіх гарадах і невялікіх мястэчках Беларусі. Так, яны існавалі ў Нясвіжы, Полацку, Дзвінску, Баранавічах, Брэсце, Вілейцы. Усе гэтыя таварыствы мелі розныя назвы, але галоўная мэта іх дзейнасці была адна і тая ж — развіццё музычнай культуры беларускіх гарадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Наканечная А.П.,**
*суіскальнік кафедры*
*беларускай і сусветнай*
*мастацкай культуры*

## СТАРОНКІ МУЗЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ ПОЛАЦКАГА КАДЭЦКАГА КОРПУСА

Мэта дадзенага артыкула — на падставе архіўных дакументаў, літаратурных матэрыялаў і звестак з перыядычнага друку асвятліць пытанні музычнага выхавання